Газета дзяржаўнай установы адукацыі
"Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа"



# Перапынак!



№8
Красавік, 2022

Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

## Чытайце ў нумары:

2 красавіка- Дзень яднання народаў стр. 2

На суботнік- усёй школай стар. 3



Месячнік бяспекі стар. 4

Чарнобыль. Захоўваючы памяць стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6

# 2 красавіка – Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі

2 красавіка адзначаецца Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. Менавіта ў гэты дзень у 1996 годзе прэзідэнты Расіі і Беларусі Барыс Ельцын і Аляксандр Лукашэнка падпісалі ў Маскве Дагавор "Аб стварэнні Супольнасці Расіі і Беларусі». Зараз нашы краіны праводзяць узгодненую знешнюю і абаронную палітыку. Цеснае партнёрства дзвюх дзяржаў у барацьбе з міжнародным тэрарызмам, арганізаванай злачыннасцю, іншымі пагрозамі насталага стагоддзя накіравана на стварэнне ўмоў мірнай і годнага жыцця кожнага чалавека. Сёння Беларусь і Расійская Федэрацыя развіваюць ўзаемавыгадныя эканамічныя сувязі, абменьваюцца дасягненнямі ў адукацыйнай сферы, культуры, навуковай думцы.

З вялікай цікавасцю навучэнцы нашай установы прымалі ўдзел у мерапрыемствах прысвечаных гэтай даце.








# На суботнік – усёй школай

Аб тым, што адбудзецца акцыя па добраўпарадкаванні тэрыторыі школы, усе работнікі і навучэнцы даведаліся яшчэ ў пачатку тыдня. Для правядзення суботніка па ачышчэнні тэрыторыі быў складзены план мерапрыемстваў, кожнаму класу быў вызначаны фронт работ, праведзены інструктажы па тэхніцы бяспекі з работнікамі і гутаркі па правілах бяспечных паводзін з навучэнцамі падчас суботніка.

Дружнай, вясёлай кампаніяй, захапіўшы з сабой працоўны інвентар і добры настрой, увесь калектыў і навучэнцы з задавальненнем паўдзельнічалі ў суботніку! Не прайшоўшы міма кожнага помніка, дворыка, клумбы, кусціка, кожнага парастка, вось-вось які імкнуўся распусціцца! Час праляцеў вельмі хутка,непрыкметна. Яшчэ раз усе пераканаліся ў тым, што МЫ-выдатная каманда!







# Месячнік бяспекі

З 4 па 30 красавіка 2022 года ў Мінскай вобласці праходзіў месячнік бяспекі, накіраваны на стабілізацыю аператыўнай абстаноўкі з пажарамі і зніжэнне рызыкі гібелі людзей ад знешніх прычын. Мерапрыемствы праводзіліся як для навучэнцаў, так і іх бацькоў. Тэматыка і іформы правядзення – самыя разнастайныя.

З найбольш важнымі аспектамі прафілактыкі падрабязна пазнаёміў памочнік начальніка па ІР і КА Дзяржынскага РАУС Варэнік Руслан Анатольевіч і нагадаў навучэнцам, што агульны ўзрост прыцягнення да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці пачынаецца з 16 гадоў, але ў пэўных выпадках ён зніжаны да 14, і гэта звязана з тым. , што ў дадзеным узросце грамадзянін у поўнай меры ўсведамляе супрацьпраўнасць сваіх паводзін.








# Чарнобыль. Захоўваючы памяць




У рамках рэспубліканскай дэкады грамадска-патрыятычных спраў "Чарнобыль. Захоўваючы памяць..." ў нашай установе адукацыі праводзіліся мерапрыемствы з мэтай фарміравання ў навучэнцаў культуры беражлівых адносін да гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны краіны праз прыцягненне іх увагі да трагедыі на Чарнобыльскай АЭС, а таксама тлумачэнні ролі дзяржавы ў вырашэнні комплекснай задачы па рэабілітацыі і адраджэнні тэрыторый, забруджаных радыенуклідамі. Для навучэнцаў прайшлі інфармацыйныя і класныя гадзіны, цыкл заняткаў экалагічнай накіраванасці, выстава літаратуры ў бібліятэцы, конкурс малюнкаў і іншыя мерапрыемствы.










# Весткі з дзіцячага сада

Месяц красавік таксама выдаўся багатым на падзеі. Мы сумесна з першым класам праводзілі спартыўныя спаборніцтвы, наведвалі іх урокі аплікацыі. Вучыліся правілам паводзін на дарозе і дома. А таксама весела гулялі і віншавалі сваіх сяброў.








